УДК 728.8.033(476.4)

***Коц А. Л.***

# ЗАПЛОТ, ЧАСТАКОЛ, ПЛЯЦЕНЬ – СЯДЗІБНЫЯ АГАРОДЖЫ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА ПОЛАЦКА (па матэрыялах ахеалагічных раскопак)

Галоўным чынам, агароджы ў сярэднявечных гарадах вызначаюць межы сядзібы. У Полацку рэшткі сядзібнай агароджы выяўлены



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на Верхнім замку і Вялікім пасадзе. Сляды агароджаў у выглядзе траншэй фіксуюцца ў Запалоцці. Найбольш распаўсюджанымі відамі агароджаў былі частаколы. Яны збудаваны з бярвенняў таўшчынёю 10–15 см укапаных ў зямлю на глыбіню 0,4–0,6 м. На сядзібе ювеліра на Вялікім пасадзе выяўлены пляцень, які пабудаваны з калкоў пераплееных лазовымі прутамі.
*Ключавыя словы:* Полацк, агароджа, частакол, сядзіба.
Mainly fences in medieval cities defined the boundaries of estates. In Polack, the remains of the estate fences have been excavated on the Upper Castle and the trading quarter Velikij Posad. The elements of fences in the form of trenches have been fixed in Zapalotsje. The most common type of fences was palisade. It was erected from logs 10-15 cm thick, buried in the ground at the depth of 0.4-0.6 m. On the territory of the estate of the jeweler in Velikij Posad, a wattle fence has been discovered, which was built from stakes intertwoven with wicker twigs.
*Keywords:* Polack, fence, palisade, estate.

Агароджы з'яўляліся вельмі важным структурным элементам сядзібы. Галоўным чынам яны вызначалі межы зямельных надзелаў, дазвалялі больш надзейна захоўваць маёмасць, бараніцца ад непрыяцеляў і нават маглі служыць сценамі для лёгкіх слупавых канструкцый. Агароджы можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя. Першыя акаляюць сядзібную прастору звонку і аддзяляюць яе ад вуліцы, суседніх сядзіб ці іншых элементаў гарадской забудовы. Унутраныя – могуць падзяляць прастору сядзібы на часткі. Напрыклад, вылучаюць жылую і гаспадарчую прасторы, або аддзяляць двор ад агарод з садам і інш. У старажытнасці найчасцей ужываўся тэрмін заплот. Частакол са слупоў быў найбольш распаўсюджанам відам агароджаў у старажытнарускіх гарадах. Сустракаецца таксама і пляцень, або так званы тын, зроблены з калкоў пераплеценых прутамі.

Захаванне агароджаў у Полацку вызначаецца наяўнасцю так званага мокрага культурнага пласта. Ён сфарміраваўся на тэрыторыі Верхняга замка і Вялікага пасада, а таксама на асобных участках Экіманьскага пасада. Рэшткі сядзібных агароджаў былі выяўлены пад час даследаванняў В. Р. Тарасенкі, А. Р. Мітрафанава і Г. В. Штыхава на Верхнім замку, пры раскопках на Вялікім пасадзе С.В. Тарасава і Д.У. Дука. Даследаванні апошніх гадоў на тэрыторыі заходняй часткі Запалоцкага пасаду таксама далі каштоўны матэрыял па забудове горада XI–XII стст. Тут выяўлены мацерыковыя ямы, якія маркеруюць сляды агароджаў.

Найбольш грунтоўныя і маштабныя даследаванні Верхняга замка былі праведзены ў канцы 1950-х – 1960-я гады. Агароджы былі выяўлены ва ўсходнім раскопе (раскопы 2 і 3) і раскопе 4. Раскопы 2 і 3 уяўляюць адну ўскрытую пляцоўку плошчай 640 м² і звязаны адной сеткай квадратаў. Магутнасць культурнага слоя дасягае 4,3–5,5 м. Асноўная маса драўляных канструкцый выяўлена ў сярэдняй зоне на глыбіні 1,5–2,5 м. Агароджы выяўлены і ў ніжняй зоне культурнага слоя. Рэшткі драўляных канструкцый падзелены на 14 будаўнічых гарызонтаў. У раскопе 4 плошчай 90 м² таксама выяўлены сляды сядзібнай забудовы ў выглядзе рэштак драўляных канструкцый. Усе пералічаныя раскопы размяшчаліся на месцы аднаго з самых густанаселеных раёнаў Верхняга замка.

У будаўнічых гарызонтах 6–9, на розных участках усходняга раскопа зафіксаваны шматлікія фрагменты частаколаў. У будаўнічых гарызонтах 10–13 дрэва захоўваецца дрэнна, але тут таксама сустракаюцца рэшткі частаколаў і асобна ўкапаныя слупы. Падрабязнага апісання канструкцый і тэхнікі іх узвядзення няма. Г. В. Штыхаў у манаграфіі "Древний Полоцк" сцісла падае, што агароджа 13 гарызонта пабудавана з укапаных у зямлю бярвёнаў. У ніжняй частцы бярвення захаваліся зарубкі, зробленыя для злучэння бярвенняў пры сплаве па рацэ [8, с. 48]. Падобную тэхніку ўзвядзення агароджаў можна сустрэць і ў іншых гарадах Усходняй Еўропы. Т. С. Бубенька вызначае, што сядзібныя агароджы ў Віцебску ўзводзіліся з сосновага бярвення. Слупы забіваліся ў глебу або ў рэдкіх выпадках укопваліся ў глебу [1, с. 51]. У Кіеве выяўлены агароджы, якія ўзводзілі пераважна з дошак-гарбылёў забітых або ўкапаных у глебу [5, с. 115, 122]. Частаколы з укапанага бярвення выяўлены ў Нераўскім раскопе ў Ноўгарадзе. Даследчыкі нават характарызуюць, што верхнія канцы частакола маглі злучацца рэйкамі, якія ўстаўляліся ў круглыя адтуліны [3, с. 45]. У Полацку магла існаваць падобная тэхнік, але як правіла частаколы тут захоўваюцца на вышыню не больш 1 м [8, с. 48, фота].

На наш погляд адна з сядзіб у азначаным раскопе была ўскрыта цалкам. У яе ўваходзілі пабудовы 6Г, 6Е, 6І і 6С. Уздоўж паўночнага частакола, бокам да вуліцы размяшчаюцца гаспадарчыя пабудовы 6С і 6І (мал. 1). Апошняя датуецца 1264 г. Адлегласць паміж будынкамі 0,6-0,8 м. Паміж імі фіксуюцца рэшткі насціла, які зроблены з тоўстых цясаных дошак пакладзеных на лагах. Яны маглі служыць памостам перад уваходам з паўночна-ўсходняга кута ў пабудову 6С, а таксама вымасткай да веснічка, які дазваляў выйсці на вуліцу. Для гэтага спецыяльным чынам быў уладкаваны частакол (мал. 1:1).

Паўднёвая мяжа сядзібы дакладна не вызначана. Магчыма, маркерам паўднёвай мяжы з'яўляюцца не толькі пабудовы 6Е і 6Г, а таксама канструкцыя паміж пабудовамі 6Г і 6Д, якая ўтворана двума парамі слупоў з закладзенай паміж імі дошкай. Але ў матэрыялах раскопак апісання азначанай канструкцыі не прадстаўлена. Пабудовы 6Е і 6Г размяшчаюцца шчыльна адна да адной (адлегласць паміж імі 0,4–0,5 м), што вызначае адсутнасць праходу на поўдзень сядзібы.

Цікавая сітуацыя была выяўлена на ўсход ад апісанай сядзібы. Тут зафіксаваны паўднёва-заходні кут суседняй сядзібы, дзе размяшчалася пабудова 6В. Паміж імі збудаваны частакол, які ўзведзены на адлегласці 0,8 м ад заходняй сцяны пабудовы 6В і завершаны паўколам каля паўднёва-заходняга кута азначанага будынка. Прызначэння такога прахода і незвычайнага канструкцыйнага элемента плота не вызначана.

У іншых выпадках у 6–9 будаўнічых гарызонтах таксама зафіксавана не менш 18 фрагментаў частаколаў, якія вызначаюць межы сядзібы. Яны складаюцца з роўных радоў укапаных ў зямлю бярвенняў. Большасць частаколаў захавалася на даўжыню 2–4 м, найбольш доўгія фрагменты агароджы дасягаюць 6 м (7 будаўнічы гарызонт).

Самыя маштабныя археалагічныя даследаванні ў Полацку былі праведзены С. В. Тарасавым на плошчы Свабоды. Ім былі ўскрыты рэшткі сядзібы XII–XIII стст. майстра-ювеліра. Паўночная мяжа сядзібы прасочваецца па рэшткам частакола уздоўж вуліцы, якую вызначаюць рэшткі маставой. Частакол быў зроблены са слупкоў дыяметрам 10–15 см. Уздоўж вуліцы ўзведзена большасць будынкаў азначанай сядзібы.

Цікавай знаходкай з'яўляецца унутрысядзібная агароджа. Гэта быў пляцень, які збудаваны з двух радоў калкоў, пераплеценых лазой. Адлегласць паміж калкамі 0,6 м. Ад плятня даследавана 103 калкі, якія зроблены з дуба і сасны [6, с. 269].

У фондах Нацыянальнага Полацкага гісторык-культурнага музея запаведніа захоўваецца 40 калкоў ад азначанага плятня. У асноўным калкі зроблены як з круглых (у сячэнні) бярвенцаў ці з тонкіх круглых (у сячэнні) жэрдак, так і з паўкруглых (у сячэнні) аполкаў. Некаторыя калкі маюць другаснае выкарыстанне і зроблены з тоўстых дошак і нават цясаных бярвенцаў трапецыяпадобнай і трохкутнай формы ў сячэнні. Большасць калкоў захаваліся на даўжыню 0,8–1,1 м. Таўшчыня круглых калкоў ад 4 да 6,5 см, аполкаў – 3х5–4х7 см. Па матэрыялам раскопак і пры візуальным абследаванні калкоў вызначана, што яны былі забіты ў глебу (у мяцярык?) на глыбіню 0,4–0,6 м [7, с. 11]. Ніжнія канцы калкоў былі завостраны на даўжыню 18–30 см і большасць кончыкаў была разбіта. Гэта падцвярджае, што калкі былі забіты ў глебу. Некаторыя круглыя калкі мелі падчэсаныя бакавыя стораны на вышыню 0,7 м. Верхнія канцы пераважна ўсіх калкоў былі зламаны пры дэмантажэ верхняй часткі агароджы, толькі на некаторых фіксуюцца сляды адсякання сякерай. Відавочна, што пляцень быў досыць моцна згніўшым за перыяд свайго існавання. Таксама на некаторых калках фіксуюцца моцна згніўшыя канцы.

С. В. Тарасавым пад час раскопак зафіксаваны фрагмент калиткі. У ніжняй частцы калиткі была пакладзена дошка даўжынёю 1,8 см, пры шырыні 18 см. З адабвух бакоў дошкі зроблены пазы для фіксацыі крайніх колашкаў плятня [6, с. 270]

Даследчык вызначае, што дадзены пляцень не мог быць знешняй агароджай. Ён падзяляў сядзібу на дзве часткі: жылую і гаспадарчую. І асаблівым падцверджаннем гэтаму з'яўляецца зафіксаваная калітка [6, с. 270]. Але на прыкладзе іншых гарадоў Усходняй Еўропы (Кіеў) мы бачым рэдкія прыклады частаколаў, якія з'яўляюцца знешняй агароджай. Паміж каламі дыяметрам 6–12 см, размяшчаўшыміся на адлегласці 30–40 см адзін ад аднаго, упляталіся пруты вярбы [5, с. 115].

Пляцоўка за 120–170 м на паўночны-захад ад перакрыжавання сучасных вуліц Гастэла і Краснова на заходняй ўскраіне пры-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ватнага сектара Запалоцкага пасада даследавалася на працягу 4 археалагічных сезонаў. У 2012 годзе на азначанай пляцоўцы (сумесна з Д. У. Дукам) было закладзена 4 раскопы. Сумарная плошчы даследаванняў склала 148 м². У 2013 г. у працяг раскопа 3 быў прырэзаны раскоп 5 плошчай 80 м². На ўсход ад раскопа 5 у 2015 г. быў закладзены раскоп 7 плошчай 22 м², які ў 2016 годзе быў пашыраны раскопам 8 (16 м²). Такім чынам раскопы 3, 5, 7, 8 звязаны агульнай сеткай і квадратаў з лічбавалітарнай нумарацыяй. Агульная плошча усіх раскопаў склала 154 м². Для ўдакладнення асобных тапаграфічных аб'ектаў закладзена шэраг шурфоў. Ускрытая плошча ўсёй даследаванай пляцоўкі на 2016 г. дасягнула 292 м² (мал. 3).

У раскопах 5, 7 і 8 (2013, 2015–16 гг.) выяўлены сляды аднаго сядзібнага комплекса (мал. 2). Яго паўночную і ўсходнюю межы вызначаюць мацерыковыя ямы траншэяпадобнай формы. У Р-5 гэта мацерыковыя ямы 5 і 6, у раскопе 8 – мацерыковая яма 3 і 7 (мал. 2).

Яма 5 мае форму траншэі. Прасочваецца ад узроўню другога стратыграфічнага гарызонта. Яма перасякае раскоп з усходу на захад праз лінію квадратаў Е. Шырыня ямы 5 – 0,2–0,3 м. Сценкі яе вертыкальныя, дно плоскае. У двух месцах у кв. Е1 і Е2 на дне зафіксаваны акруглыя паглыбленні на 0,1–0,15 м. Агульная глыбіня ямы (з улікам культурных напластаванняў, якія яна пра-разае) 0,3 м. Запоўнена яна аднароднай цёмнашэрай зямлёй, у верхняй частцы гумусам чорнага насычанага колеру. Знаходкі прадстаўлены венцам і сценкамі гаршкоў XI–XII стст. [4, с. 9].

Яма 6 мае форму траншэі і пралягае паралельна яме 5 за 0,6-0,7 м на поўнач ад яе. Прасочваецца яна ад узроўню другога стратыграфічнага гарызонта. Яма перасякае раскоп з усходу на захад праз лінію квадратаў Е. На ўзоўні другога стратыграфічнага гарызонта ў кв. Е1' яма 6 мела ізгін на поўнач, і такім чынам акаляла межы ямы 14. Шырыня ямы 0,4 м. Сценкі ямы вертыкальныя, дно плоскае. Агульная глыбіня ямы (з улікам культурных напластаванняў) 0,25–0,3 м. Запоўнена яна аднароднай цёмнашэрай зямлёй, у верхняй частцы гумусам чорнага насычанага колеру з украпінамі вуглю. Знаходкі прадстаўлены фрагментамі керамікі XI-XII стст. і косткай жывёлы [4, с. 9].

За 0,1–0,2 м на поўнач ад мацерыковай ямы 6 (паралельнаёй) выяўлены сляды частакола. У палявой дакументацыі яны пазначаны як мацерыковая яма 15. Частакол фіксуецца па шэрагу дробных ямак, якія перасякаюць раскоп па лініі кв. Е1, Е2, Е3. На ўзроўні трэццяга стратыграфічнага гарызонта прасочваюцца сляды частакола і ў кв. Е1'. Дыяметр ямак да 0,07 м. Глыбіня ў сярэднім каля 0,1–0,12 м. Зафіксаваны сляды 32 ямак ад частаколу. Запоўнены ямкі цёмнашэрай зямлёй [4, с. 10].

У раскопе 7 (2015 г.) усе азначаныя траншэі не прасочваюцца, бо пашкоджаны іншымі археалагічнымі аб'ектамі.

У раскопе 8 (2016 г.) выяўлены дзве траншэяпадобныя мацерыковыя ямы 3 і 7. Яма 7 мае форму траншэі і перасякае раскоп з усходу на захад праз квадрат Е7. Яна пралягае па адной лініі з мацерыковай ямай 6 (раскоп 5) (мал. 2). Сляды ямы прасочваюцца ад узроўню другога стратыграфічнага гарызонта. Шырыня траншэі на ўзроўні мацерыка – 0,4 м, сценкі – вертыкальныя, дно – плоскае. Агульная глыбіня ямы (з улікам культурных напластаванняў) 0,2м. Запоўнена аднародным чорным слоем зямлі з камянямі.

Мацерыковая яма 3 выяўлена па лініі квадратаў Г7, Д7, Е7. Шырыня мацерыковай ямы 3 – 0,2–0,3 м, глыбіня – 0,2 м. Запоўнена слоем светлакарычневага колеру. Агульны яе накірунак па лініі поўнач-поўдзень. Яна пракладзена перпендыкулярна мацерыковай яме 7. На мяжы квадратаў Г7 і Д7 мацерыковая яма робіць нязначны выгін на ўсход. Ён быў зроблены для таго, каб выгарадзіць жылую пабудову, якая знаходзілася па заходні бок ад мацерыковай ямы. Сама траншэя завершана за 0,4 м ад мацерыковай ямы 7. На гэтым прамежку зафіксаваны сляды 3-ох ямак ад частаколу.

Сляды мацерыковых траншэй фіксуюцца на захад ад даследаванай пляцоўкі ў раскопе 2 (2012 г.), у шурфе 1 (2016 г.) і ў культурным пласце раскопа 1 (2012 г.).

У раскопе 1 (2012 г.) у перадмацерыковым слое былі зафіксаваны дзве лінзы пяску з чорнай зямлёй, якія перасякалі раскоп з захаду на ўсход (адна – па лініі квадратаў І, другая – па лініі квадратаў 3) [2, фота 4]. Яны ўяўляюць сабой траншэяпадобныя паглыбленні ў ніжнім стратыграфічным гарызонце. Магутнасць іх залягання каля 0,2 м. Яны размяшчаліся на адлегласці каля 2 м адна ад другой і не зафіксаваны ў мацерыковым пяску. Відавочна, што гэта рэшткі агароджы-плота сядзібы. Сляды паўднёвай траншэі (па лініі квадратаў 3) ў кв. 32 і 33 мае размятыя контуры. Траншэя па лініі квадратаў І прасочваецца ў раскопе 2 (2012 г.). На глыбіні 0,7–0,9 м ад дзённай паверхні ўздоўж паўднёвай сценкі раскопа 2 зафіксавана выцягнутая лінза зямлі з пяском светла-шэрага колеру (на адлегласці 0,25 м ад паўднёвай сценкі раскопа). Яе шырыня – 0,2–0,3 м. [2, с. 7].

Паміж раскопамі 1 і 2 (2012 г.) у 2016 г. быў закладзены шурф 1 (мал. 3). У межах дадзенага шурфа на ўзроўні мацерыковай паверхні выяўлена мацерыковая яма 1 траншэяпадобнай формы на даўжыню 4 м. Яна выцягнута з поўначы на поўдзень з невялікім выгінам. Шырыня траншэі дасягае 0,4 м, глыбіня 0,2–0,35 м. Запоўнена мацерыковая яма цёмнашэрай зямлёй з рэдкімі ўкрапінамі вуглю. Сляды мацерыковай ямы 1 прасочваюцца на адлегласці 5 м па адной лініі на поўдзень ад шурфа 1. Выяўлена, што мацерыковая яма 1 працягваецца і на поўнач на 3 м ад шурфа, да перасячэння з траншэяй, якая выцягнута па лінніі захад-усход. Усе азначаныя траншэі і лінзы зямлі вызначаюць сляды сядзібных агароджаў, якія размяшчаюцца ў адну лінію з вышэйапісанымі сядзібамі (у раскопах 5, 7, 8). Відавочна, што тэхніка ўзвядзення платоў на даследаванай пляцоўцы аднолькавая.

На тэрыторыі Запалоцкага пасада выразна прасочваецца адна лінія сядзібнай забудовы (мал. 3). Яна выцягнута з захаду на ўсход і вызначае паўночную мяжу сядзібных комплексаў. Фарміраванне адной лініі агароджы прасочваецца на адлегласці 85 м. Фіксуюцца 2 будаўнічыя этапы ўзвядзення агароджаў і сляды рамонту (мал. 3). Па археалагічных знаходках сядзібная забудова датуецца ў межах XII ст.

Такім чынам у Полацку ў старажытнарускі перыяд асноўным відам агароджы былі частаколы з укапаных у глебу бярвенняў дыяметрам 10–15 см. Падобныя віды агароджы выяўлены на Верхнім замку і на Вялікім пасадзе. У Запалоцкім пасадзе зафіксаваны сляды падобнай агароджы ў выглядзе мацерыковых ям, якія вызначаюць адну лінію сядзібнай забудовы на даўжыню 85 м. Яны маглі адгароджваць двор ад вуліцы, і размяжоўвалі паміж сабою сядзібы. Таксама, на Верхнім замку зафіксаваны фрагмент адной міжсядзібнай агароджы, якая складалася з двух пар слупоў з закладзенымі паміж імі дошкамі (бярвеннем?). На Вялікім пасадзе на сядзібе ювеліра выяўлены адзін пляцень, які з'яўляўся ўнутранай агароджай і мог падзяляць сядзібу на 2 часткі.

**Літаратура:**


1. Бубенько, Т. С. Средневековы Витебск. Посад – Нижний замок (Х – первая половина XIV в.) / Т. С. Бубенько. – Витебск: Издательство УО "ВГУ им. Машерова", 2004. – 276 с.
2. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Запалоцкага пасаду г. Полацка ў 2012 г. – Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага Навуковага Архіва НАН Беларусі. – Спр. № 3105.
3. Засурцев, П. И. Усадьбы и постройки Древнего Новгорода / П. И. Засурцев // Материалы и исследования по археологии СССР (№ 123). Жилища древнего Новгорода. Труды Ногородской археологическо экспедиции. Том IV. – Москва : Академия наук СССР, 1963. – С. 5–165.
4. Коц, А. Л. Справаздача аб археалагічных раскопках на тэрыторыі Запалоцкага пасаду г. Полацка ў 2013 г. – Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага Навуковага Архіва НАН Беларусі. – Спр. № 3099
5. Новое в археологии Киева / ред. Кол. П. П. Толочко (отв. ред.) С. А. Высоцкий, Я. Е. Боровский. АН Украинской ССР. Институт археологии. – Киев: Новая думка, 1981. – 457 с.
6. Тарасов, С. В. Отчёт о раскопках в г. Полоцке в 1987 г. – Фонд археологической научной документации Центрального Научного Архива НАН Беларуси. – Дело № 1014.
7. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 1.** Усходні раскоп на Верхнім замку паводле Г. В. Штыхава:
1 – месца ўладкавання выхаду (веснічка) з сядзібы на вуліцу; 2 – сляды паўднёвай агароджы сядзібы; 3 – месца праходу і спецыфічнага завяршэння агароджы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 2.** Пазначэнне зафіксаваных слядоў забудовы Запалоцкага пасада ў межах раскопаў 3 (2012 г.), 5 (2013 г.), 7 (2015 г.) і 8 (2016 г.). Пунктірам пазначаны сляды агароджы




**Мал. 3.** Сетка раскопаў у заходняй частцы Запалоцкага пасада з пазначэннем выяўленай лініі сядзібных агароджаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова